ПРОЛЕТАРЫ ЎСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

2 СЬНЕЖНЯ 1931 г.
№ 278 (1546)

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

ОРГАН ЦК І МЕНГАРКОМУ ЛКСМБ

...згарнуць падрыхтоўку

...товы пленум ЦК ЛКСМБ ра... пытаньне ўдзелу комсамолу ...ізацыі партыйных дырэктыў ...араўленьню чыгуначнага тран... Перад комсамольскай арга...ый стаіць задача: рэалізуючы ...нову аб'яднанага пленуму ЦК ...Б і ЦКК аб чыгуначным тран..., разгарнуць вялікую работу ...адрыхтоўцы к пленуму ЦК ...Б.

...оўныя вымернікі па МББ і ...іх чыгунках не выкананы за ... дэкаду лістапада, што сьвед... аб невыстарчальных тэмпах ...ізацыі пастаноў пленуму ЦК ...Б.

...бег паравозаў у таварным ... выканан Жлобінскім вузлом ...,2 проц., Віцебскім — 81,7 ... Аршанскім—93,94 проц.

...нэ горш з прабегам вагонаў ...ага парку. Гомель выканаў ...усяго на 67,9 проц., Ворша ...88,1 проц. і Жлобін—на 92,6 ...

...едваньне таварных цягнікоў ...складу характарызуецца на...ым чынам: Віцебскі вузел вы... вымернікі на 43,6 проц., ...скі—на 68,5 проц., Гомель... 80,5 проц. і Жлобінскі на ...проц. Надзвычай вялікі про...творых паравозаў. Да гэтага ... ня выканан загад аб павы... прабегу паравозаў і ваго... адну гадзіну.

...самол за гэта у адказе! Кож...ыў спаранай язды, кожнае ...еньне цягніка—конкрэтны аб...йца комсамольскай чыгунач... арганізацыі.

...ікая доля віны за такую рэалі... важнейшых партыйных дакум... кладзецца на гарадзкія і ...ыя камітэты комсамолу. Ва ...ўшых нумары „Чырвонай ...ы" мы паказалі як гомельскі ...мол опортуністычна недаацаніў ...сьць работы чыгуначнага ...порту, за паўгода займаўся ... пытаньнем 2 разы. Комса...скія організацыі Гомельскага ... апынуліся ў абозе бальша... работы па аздараўленьню ...порту. Правал работы Гомель... чыгуначнай організацыі на ...гаркамолу павінен паслужыць ...ом для усёй комсамольскай ор...ацыі Беларусі.

...мсамолія ўсіх чыгуначных вуз... Беларусі, уключыўшыся у ста... паход павінна зараз-жа прак... рэалізаваць пастанову плену... ЦК КП(б)Б.

...аячасова адрамантаваць пара..., праверыць і адрамантаваць ...аачышчальнікі, каб сустрэць ...жныя заносы ва ўзброеньні. Раз...уць барацьбу за маршрутыза... наладзіўшы па вопыту Жло... шэфства над вагонным пар... змагацца за кожны адраман...ны вагон, выдаць яму пашпарт ...сіць асноўныя вымернікі—вось ...овыя задачы.

...ленум ЦК КП(б)Б адначыў, ... на чыгуначным траспорце фак... няма гаспадарчага разрахун... Ленінскі комсамол павінен вы... лёзунг: „Кожная комсамоль... брыгада — гасразрахунковая, ...ны комсамольскі паравоз—на ...гаспадарчы разрахунак".

...азгортваючы сталінскі паход, ...комсамольскія чыгуначныя організацыі павінны, нарэшце, дабіц... рэалізацыі ўсіх партыйных ды...ктыў у адносінах чыгуначнага ...транспорту.

...бліжэйшы месяц трэцяга рашаючага ... пяцігодкі патрабуе максімаль... напружанасьці ўсіх транспарт... організацый, ад якіх у знач... меры залежыць пасьпяховае ...выкананьне плянаў гэтага году. ...Рэалізуючы 6 гістарычных умоў ...выстаўленых т. Сталіным, рэалізую... бальшавіцкі загад т. Андрэева ... пастанову пленуму ЦК КП(б)Б, ...чыгуначны транспорт БССР са сва... задачай справіцца.

5-га сьнежня—зьлёт ударнікаў фінэстафэты

Перамагчы бар'еры адставаньня

Да зьлёту прыйсьці з посьпехамі ў выкананьні пляну мобілізацыі сродкаў

5-га сьнежня адкрываецца зьлёт ударнікаў фінэстафэты.

Комсамольскім організацыям да зьлёту неабходна прыйсьці з посьпехамі ў выкананьні фінпляну.

Неабходна скарыстаць вопыт комсамоліі заводу імя Варашылава, які перавыканаў свой плян на 20 проц. Мэтоды і спосабы організацыі масавай работы па мобілізацыі сродкаў павінны быць пераняты ад варашылаўцаў.

Скарыстаць вопыт варашылаўцаў—наша задача.

Разгарнулі падрыхтоўку да зьлёту

У мобілізацыі сродкаў і падрыхтоўцы да зьлёту ўдарнікаў фінансавага фронту комсамолія машынабудаўнічага заводу Варашылава прарабіла шмат,

У ашчадкасу паступіла ўкладаў на 37 тыс. руб. Плян мобілізацыі сродкаў за кастрычнік і верасень перавыканан на 20 проц. Колектыўным страхаваньнем ахоплены ўсе рабочыя.

Сход робочае моладзі вызначыў далейшыя шляхі задачы комсамольскай організацыі ў справе мобілізацыі сродкаў. Сход азначыў, што ня гледзячы на актыўны ўдзел комсамольцаў у мобілізацыі сродкаў бюро камітэту не кіравала сыстэматычна гэтай працай, новыя рабочыя не ахоплены падпіскай на пазыку.

Каб палепшыць кіраўніцтва комсамольскімі ячэйкамі, пры бюро камітэту організаваны спэцыяльны сэктар фінансавай работы. Комсамольская організацыя пастанавіла вылучыць соцнамесьніка-загадчыка заводзкай ашчадкасай. На заводзе для дапамогі і інструктажу вызначана 15 чалавек грамадзкіх інструктароў фінпрацы. Большасьць з іх —комсамольцы.

Вельмі дапамож ў правядзеньні фінансавай эстафэты літаратурны гурток. Зараз гурток працуе над стварэньнем спэцыяльнага рэпэртуару для мастацкай агітгрупы заводу.

І. Розенкранц.

23 проц. аформленай падпіскі

Барысаў. Заўком і партыйна-комсамольскія організацыі Барысаўскага комбінату не ўдзялілі максімум увагі мобілізацыі сродкаў. Сярод рабочых і служачых заводу не праведзена растлумачальная праца аб значэньні мобілізацыі сродкаў у выкананьні вытворчага пляну свайго заводу.

Падпіскай на пазыку „3-ці рашаючы" ахоплена 52 проц. рабочых Значна горш справа з аформленьнем. Падпіска аформлена толькі на 23 проц.

Л. Гарэцкі.

Месячнік апрацоўкі і загатоўкі лёну

Менш цыркуляршчыны, больш практычнай дапамогі ячэйкам

Не падмяняць опэрацыйнае кіраўніцтва і конкрэтную дапамогу ячэйкам у апрацоўцы і загатоўцы лёну—цыркуляршчынай

А райком усё піша, піша

Рагачэў. У загатоўках ільнавалакна і пянькі па раёне ўзяты нізкія тэмпы. На 20-е лістапада гадовы плян ільнавалакна выканан на 17 проц, ільнянога насеньня—39,7 проц, пянькі—4,1 проц. і канапель—13,5 проц.

Асабліва дрэнна ідуць загатоўкі ў колгасным сэктары. Колгасы гадовы плян ільнавалакна выканалі на 0,6 проц. насеньня лёну—20,7 проц. пянькі—0 проц. і канапель —2,2 проц.

Асноўная прычына нізкіх тэмпаў загатовак у тым, што на пачатковую апрацоўку лёну ў колгасах і аднаасобным сэктары зусім мала звароч аецца ўвагі. Пастанова ЦК-КП(б)Б аб месячніку першапачатковай апрацоўкі і загатоўкі не даведзена да шырокіх мас колгасьнікаў беднякоў і серадзякоў аднаасобнікаў. Рад колгасаў не апрацавалі і ня здалі дзяржаве ні аднаго кілё лёну. Райколгассаюз, раённыя загатоўчыя організацыі, а таксама сельсаветы нічога конкрэтнага не зрабілі і ня робяць, каб па-ўдарнаму наладзіць апрацоўку і загатоўку лёну.

Сельсаветы і загатоўчыя організацыі ня робяць націску на кулацка-заможныя гаспадаркі і ня ведаюць якія з іх здалі лён і якія не здалі. Цьвёрдыя заданьні выконваюцца самацёкам.

Напрашваецца пытаньне: што-ж робіць комсамольская організацыя, каб выканаць дырэктыву партыі і ЦК комсамолу аб пачатковай апрацоўцы і загатоўцы лёну? Райком толькі і робіць, што піша ячэйкам дырэктывы „уключыцца ў месячнік", узмацніць работу" і г. д. Практычнай дапамогі ячэйкам не дае аніякай, нават не праверыў ці ўсе ячэйкі ўключыліся ў месячнік, як яны організавалі пераапрацоўку лёну, ці ўкаранілі зьдзельшчыну, соцспаборніцтва і ўдарніцтва, Райком не перабудаваў свайго кіраўніцтва на опэрацыйныя рэйкі; ня толькі не дапамагае, а і не ведае ў якіх ячэйках апрацоўка і загатоўка лёну ідзе лепш, у якіх горш.

Мы патрабуем ад Рагачэўскага райкамолу тэрмінова праверыць: ці ўсе ячэйкі ўключыліся у месячнік, як працуюць сушыльныя, мяльныя і трапальныя пункты, практычна дапамагчы ячэйкам перавесьці работу ільнаапрацоўчых пунктаў на прэміяльна-прогрэсыўную зьдзельную аплату працы, організаваць ударныя комсамольскія брыгады ў дапамогу колгасам.

Разам з гэтым, зараз-жа праверыць ці ўсе кулацка-заможныя гаспадаркі атрымалі цьвёрдыя заданьні і ці выконваюць іх, і дабіцца, каб кулацка-заможныя гаспадаркі здалі цьвёрдыя заданьні ў найкарацейшы тэрмін.

А. Р.

Перадайце свой вопыт іншым ячэйкам

Ячэйка колгасу „Чырвоны араты", Чамаданская, Сасьнякоўская і Сьліжаўскі колектыў ЛКСМБ (Шклоўскі раён) па-ўдарнаму змагаюцца за пераапрацоўку і загатоўку лёну.

Чамаданская ячэйка, склаўшы ўдарныя брыгады з комсамольскай і беспартыйнай моладзі, дапамагла колгасьнікам Фашчаўскага сельсавету пераапрацаваць 20 возаў лёну. 25 лістапада гэтыя колгасы здалі дзяржаве першую партыю добраякаснага ільнавалакна.

Сасьнякоўская ячэйка наладзіла здачу на завод трасты. Для гэтага ячэйка стварыла ўдарныя комсамольскія брыгады, якія абходзілі колгасы і бядняцка-серадняцкія гаспадаркі, правяраючы ці выконваюцца кантрактацыйныя ўмовы на здачу трасты. У гэты-ж час брыгады праводзілі гутаркі аб неабходнасьці ў найкарацейшы тэрмін выканаць свае абавязацельствы перад дзяржавай. Організаваўшы чырвоныя абозы з колгасьнікаў і аднаасобнікаў, комсамольскія брыгады дабіліся, што сельсавет здаў трасты на 70 проц. пляну.

Колгас „Чырвоны араты" пры апрацоўцы лёну ня ўжываў зьдзельшчыны, соцспаборніцтва і ўдарніцтва, чаму не забясьпечыў своечасовую здачу валакна дзяржаве. Каб узьняць тэмпы апрацоўкі і датэрмінова выканаць абавязацельствы перад дзяржавай, комсамольская ячэйка прапрацавала з колгасьнікамі пастанову партыі аб месячніку пераапрацоўкі і загатоўкі лёну. Сушыльшчыкі, мяльшчыкі і трапальшчыкі перайшлі на зьдзельшчыну, разгарнулі паміж сабой соцспаборніцтва і ўдарніцтва. Тэмпы апрацоўкі хутка ўзьняліся. За адну дэкаду колгас апрацаваў і здаў дзяржаве палову свайго заданьня.

Бліскучы прыклад барацьбы за лён паказвае Сьліжаўскі колектыў ЛКСМБ. Комсамольцы стварылі 15 ударных брыгад у дапамогу колгасам. *Ужо* больш 5-ці дзён працуюць брыгады і абавязаліся не пакідаць колгасаў пакуль не даб'юцца стопроцантнага выкананьня пляну апрацоўкі і здачы ільнавалакна дзяржаве.

Першыя крокі конкрэтнай барацьбы за лён зроблены. Але гэтага мала. Яшчэ няма перамогі. Трэба з большай напорыстасьцю біцца за датэрміновае выкананьне плянаў здачы (продажу) дзяржаве ільнавалакна. Усе магчымасьці для гэтага ёсьць. Добры вопыт барацьбы за лён трэба абагуліць і перадаць іншым ячэйкам раёну.

Загорскі.

Новыя антысавецкія манэўры японскай вагнішчыны

„Манчжурскі канфлікт можа адыграць ролю балканскай вайны напярэдадні 1914 г."

(З прамовы т. Дорыё ў палаце дэпутатаў)

ПАРЫЖ. Учора т. Дорыё выступіў у палаце дэпутатаў (француск і парлямант) з запытам аб „позыцыі Лігі нацый у манчжурскім конфлікце і аб пагрозе, накіраванай супроць СССР". Тав. Дорыё паказаў на тое, што **манчжурскі конфлікт узмацняе небясьпеку вайны ва ўсім сьвеце** і можа адыграць ролю мароканскага конфлікту, альбо балканскіх войн напярэдадні 14 году, адчыняючы новую эру імпэрыялістычных конфліктаў.

Ужо 3 месяцы ў Манчжурыі працягваецца японска-кітайская вайна, і Ліга нацый і пакт Келёга, якія існуюць нібыта для папярэджваньня войн, выявілі сваё поўнае бясьсільле. 3 месяцы доўгіх спрэчак у Лізе нацый паказалі поўнае супольніцтва Лігі з японскім імпэрыялізмам. Савет пасылае „камісію вывучэньня" ў Манчжурыю і Кітай. *Здавалася-б* **пытаньне яснае: Японія займае чужую тэрыторыю, і дзеля таго, каб прапанаваць ёй эвакуяваць гэтую тэрыторыю, не патрабуецца ніякіх абсьледваньняў, аднак Ліга нацый ня можа заняць такой позыцыі, ня можа патрабаваць ад Японіі эвакуяваць кітайскую тэрыторыю і сама Ліга нацый зьяўляецца Лігай імпэрыялістых, якая раздае колёніяльныя мандаты. Як ёй у такім разе ня быць у поўнай згодзе з японскім імпэрыялізмам?**

Ці не зьяўляецца гэта абсьледваньне пачаткам канчатковага падзелу Кітаю, якога патрабуюць калёнізатары ўсіх краін?

Японія ў поўнай меры абараняе французскія інтарэсы. Францыя трымае 10 тысяч салдат у Кітаі, мае ў ім свае концэсіі, сфэры ўплыву. чыгункі ў Хунані, таксама як Японія ў Манчжурыі. **Якім чынам можна ад вас чакаць, што вы патрабуеце ад Японіі пакінуць Манчжурыю, калі вы самі ў 1929 годзе выступалі ўзброенай сілай супроць кітайскіх саветаў?**

Японія гарантавала французскаму ўраду поўнае патрыманьне на конфэрэнцыі па разброеньню яго пункту погляду: мы ня хочам разбройвацца ні на сушы, ні на моры, ні ў паветры.

Ужо зараз 80 млн. кітайцаў аб'яднаны пад уладай кітайскіх савецкіх урадаў, і калі-б не дапамога, якую імпэрыялістыя аказваюць кітайскай контррэволюцыі, савецкае ўлада распаўсюдзілася-б па ўсім Кітаі...

Мэта камісіі вашай Лігі нацый даволі ясная: падрыхтаваць па японскаму ўзору інтэрвэнцыю супроць кітайскіх саветаў

Сусьветны імпэрыялізм ня можа дараваць СССР ня толькі таго, што ў гэтай краіне пасьпяхова праводзіцца соцыялістычнае будаўніцтва, але і таго, што СССР у 24 годзе зрабіў пралом ў імпэрыялістычнай сыстэме ў Кітаі, ануляваўшы савецка-кітайскаю згодай 1924 году ўсе няроўныя дагаворы, што зьявілася першым прызнаньнем незалежнасьці Кітаю з боку буйнай дзяржавы. Гэта вы ніколі не даруеце СССР.

Ці не таму францускі ўрад не протэстуе супроць японскага гвалтоўнага ўрываньня ў паўночную Манчжурыю што ён мае надзею скарыстаць японска-кітайскую вайну дзеля таго, каб зноў узьняць пытаньне аб Кітайска-Усходняй чыгунцы, вырашанае савецка-кітайскім дагаворам 24 году?

„Рэвю Мілітэр францэз" орган французскага генэральнага штабу настойвае на тым, што Францыя мае свае правы" на КУ чыгунку і напамінае аб проектах інтэрнацыяналізацыі гэтай чыгункі распрацаваных у 1929 г

Ці ня маеце вы надзеі зноў узьняць пытаньне аб КУ чыг. скарыстаўшы сучасную вайну ў Манчжурыі, ці не аб гэтым ішла гутарка ў вашых перамовах з Японіяй? Гэта запытаньне я стаўлю ўраду.

У сучасным конфлікце СССР зноў пацьвердзіў сваю політыку міру. У адказ на провокацыю Японіі. СССР цьвёрда заявіў, што няхоча ўмешвацца ў япона-кітайскі конфлікт, і што політыка окупацыі, якую праводзіць Японія пагражае міру.

На рэпліку соцыяліста Грумбаха т. Дорыё адказвае: „Констатуем, што ў даным конфлікце соцыялісты абрушваюцца на СССР, а не на Японію. У наяўнасьці коаліцыі ўсіх парляманцкіх фракцый, акрамя комуністычнай. гэтая коаліцыя падтрымлівае японскі імпэрыялізм.

Далей т. Дорыё заяўляе, што адваўленьне міру на Далекім Усходзе магчыма толькі пры неадкладнай эвакуацыі японскіх войск і ануляваньні японскіх „асобых правоў" у Манчжурыі, дзеля чаго неабходна скасаваньне ўсіх няроўных дагавароў.

„праз галаву палаты я зьвяртаюся к пролетарыяту і к народам усяго сьвету з заклікам, каб яны былі дбайны і стварылі адзіны фронт барацьбы супроць імпэрыялістычных бандытаў, для абароны прыгнечаных народаў і соцыялістычнай бацькаўшчыны—СССР.

Рэйд брыгад „Чырвонай Зьмены“

Падрыхтоўку кадраў—у ногу з разьвіцьцём тарпянай прамысловасьці

Комсамолія тарпянай прамысловасьці павінна няўхільна змагацца за пашырэньне сеткі школ ФЗВ, за якасьць грамадзка-палітычнага і тэорэтычна-вытворчага выхаваньня вучняў

Магутны рост тарпяной прамысловасьці, больш шырокае ўкараненьне механізацыі ня толькі ўсіх працэсаў торпаздабычы, але і падрыхтоўчых работ—асушкі, уборкі і транспортоўкі торпу—на іншаму ставіць пытаньне аб інжынэрна-тэхнічных і адміністрацыйных сілах.

Зараз мала навучыць тарпяніка ўладаць лапатай—яго трэба навучыць кіраваць машынай, трэба паставіць у руля кіраўніцтва людзей з веданьнем моторам, механізмам і г. д.

Выходзячы з пляну торпаздабычы ў 1286 тысяч тон, неабходна надрыхтаваць праз сетку курсаў і школ на ніжэйшай кваліфікацыі, якія ўжо існуюць і знаходзяцца ў проекце начальнікаў агрэгатаў—92 чал., параўшчыкоў—140, трактарыстых—314 моторыстых—85 і дзесятнікаў—192 чал.

Асноўнаю формаю падрыхтоўкі вышэй адзначаных катэгорый рабочых павінны стаць школы ФЗВ. Менш за ўсё патрэбны каротка-тэрміновыя курсы. Вырашаючы тэмпы ў падрыхтоўцы кадраў, такія курсы не дадуць добраякасных кваліфікаваных рабочых, якія па тэорэтычнай адукацыі і практычнай працы на вытворчасьці можна было-б процістаставіць складаным машынам і мэханізмам, узросшай мэханізацыі торпянага Донбасу.

Неабходна ўлічыць урокі мінулага году, калі, дзякуючы слабай кваліфікацыі камандзіраў механічных установак, мы мелі аграмадныя прастоі абсталяваньня. Сетка каротка-тэрміновых курсаў, якую проэктуе аддзел кадраў Белторпу, не адпавядае ўзросшым запатрабаваньням торпапрамысловасьці. Аддзел кадраў на сур'ёзна па-саматужніцку ўзяўся за вырашэньне проблемы кадраў для тарпянай прамысловасьці.

Згодна пляну забясьпечаньня тарпянай прамысловасьці кваліфікаванымі кадрамі, амаль усе заводы павінны заняцца пытаньнем падрыхтоўкі квал фікаванай рабочай сілы. Гэта задача надзвычай складаная. Мы ня маем у наяўнасьці неабходнай колькасьці настаўніцкага складу на кожным торпазаводзе паасобку. А гэта галоўнае ня ўлічыў аддзел кадраў Белторпу.

Трэба асноўную ўвагу сконцэнтраваць на організацыі новых школ ФЗВ, на палепшаньне якасьці грамадзка-палітычнага і тэорэтычна-вытворчага нав чаньня ва ўжо існуючых школах.

Па-іншаму павінна быць пастаўлена падрыхтоўка сталых кваліфікаваных рабочых кадраў. Трэба па кончыць з саматужніцтвам у падрыхтоўцы тавіх катэгорый рабочых як трактарыстыя, моторыстыя, параўшчыкі, электрыкі, сьлесары і іньш Буйныя торпазаводы, як Асінторп, Добруш і „Чырвоны сьцяг“, трэба зрабіць цэнтрамі надрыхтоўкі рабочых кваліфікаваных кадраў для ўсёй торпапрамысловасьці БССР. Толькі гэта зможа пасьпяхова вырашыць проблему кадраў для тарпянага Донбасу.

Аднак, на гэтым вучастку ня ўсё ў парадку. „Чырвоная Зьмена“ ня раз сыгналізавала аб прарывах у працы Клімавіцкай школы ФЗВ. Да гэтага часу ня складзены адпаведныя ўмовы для 626 фабзавучнікаў Клімавіцкай і Добрускай школ. Няма патрэбнай колькасьці вучэбнай і жыльлёвай плошчы, школы не забясьпечаны выкладчыкамі (асабліва па спэцыяльных прадметах), надзвычай дрэнна пастаўлена грамадзка-палітычнае і тэорэтычна-вытворчае навучаньне ў гэтых школах.

На палепшаньне якасьці навучаньня ў школах ФЗВ павінна быць накіравана энэргія комсамольцаў тарпянай прамысловасьці.

Каротка-тэрміновыя курсы, як выхад са становішча ў гэтым годзе надалей не павінны легчы ў аснову падрыхтоўкі кваліфікаваных рабочых кадраў. Гэта трэба улічыць і ў сучасны момант, каб забясьпечыць тарпяную прамысловасьць кадрамі неабходна зьвярнуць асаблівую ўвагу партыйна-комсамольскіх і профсыянальных організацый заводаў на організацыю курсаў к вызначанаму тэрміну.

Ня меншыя задачы пастаўлены перад тарпянай прамысловасьцю ў галіне падрыхтоўкі інжынэрна-тэхнічных кадраў сярэдняй і вышэйшай адукацыі па спэцыяльнасьцях: торпмэйстра, мэханіка, рацыяналізатара, тэхнолёга, гудзўніка, пудейца электрыка і інш.

233 тэхніка і 69 інжынэраў неабходна даць тарпяному Донбасу ў 1931 годзе. Задача складаная. і патрабуе бальшавіцкіх тэмпаў, Аднак узятыя тэмпы не забясьпечваюць ні колькаснай. ні якаснай падрыхтоўкі інжынэрна-тэхнічных працаўнікоў.

Яшчэ дрэнна пастаўлена праца ў тарпяным інстытуце і тэхнікуме. Спэцыяльныя дысцыпліны поўнасьцю не выкладаюцца, зрываецца выкананьне акадэмічнага пляну. У інстытуце не хапае 17-ці выкладчыкаў, а ў тэхнікуме—4, выключна па спэцыяльных прадметах. Ня гледзячы на гэта, ні Белторп, ні ВСНГБ ня ўжылі належных захадаў да стопрацантнага ўкомплектаваньня торпінстытуту і тэхнікуму выкладчыцкім пэрсоналам.

Усё вышэй паданае гаворыць аб тым, што ўзятыя тэмпы ў падрыхтоўцы кадраў для тарпянай прамысловасьці ня змогуць задаволіць узросшых запатрабаваньняў.

Партыйна-комсамольскія і профсыянальныя організацыі тарпянай прамысловасьці павінны ў пытаньнях падрыхтоўкі кадраў наставіць працу так, каб сэзон 1932 году сустрэць тэхнічна ўзброенымі.

Алешкевіч, Каротхіна і Куцэрман

За краіну суцэльнай пісьменнасьці

Ліквідацыя няпісьменнасьці—баявая задача на бліжэйшы пэрыяд

Аб ходзе ліквідацыі няпісьменнасьці

Пастанова сэкратарыяту ЦК КП(б)Б ад 21 лістапада 1931 году *)

1. ЦК КП(б)Б канстатуе зусім нездавальняючыя тэмпы разгортваньня работы па выкананьню пастановы ЦК КП(б)Б і СНК аб паголоўным ахопе навучаньнем усіх няпісьменных і малапісьменных і ператварэньню БССР да 1 мая 1932 году ў краіну суцэльнай пісьменнасьці.

2. Такое становішча стварылася ў выніку таго, што партарганізацыі і органы НКА не забясьпечылі баявых тэмпаў у галіне разгортваньня работы і мобілізацыі навакол яе шырокай грамадзкасьці.

Большасьцю РК КП(б)Б зусім недастаткова ўдзяляюць увагі і кіраўніцтва справай ліквідацыі няпісьменнасьці, ня выконваюць пастанову ЦК КП(б)Б аб тым, што ліквідацыя няпісьменнасьці павінна стаць баявой задачай партыі ў бліжэйшы пэрыяд.

3. Побач з гэтым ЦК КП(б)Б адзначае сапраўды бальшавіцкія тэмпы барацьбы за суцэльную пісьменнасьць гомельскай арганізацыі, якія дабіліся поўнага ахопу няпісьменных.

Выходзячы з гэтага ЦК КП(б)Б пастанаўляе:

Даручыць НКА з удзелам ЦСПСБ, ЦК ЛКСМБ і Колгасцэнтру на працягу праводзімага двухдэкадніка барацьбы з прарывамі ў ліквідацыі няпісьменнасьці, забясьпечыць поўны ахоп усіх няпісьменных навучаньнем, мобілізаваць на выкананьне гэтага шырокую грамадзкасьць. Культпропу ЦК і НКА камандыраваць у найбольш адсталыя раёны ўпаўнаважаных, на якіх разам з РК КП(б)Б ускласьці адказнасьць за ліквідацыю прарываў. НКА узмацніць інспэктарскае кіраўніцтва лікпунктамі, узяўшы на асаблівы нагляд ход работы на ўдарных вучастках будаўніцтва (новабудоўлі, чыгунка, саўгасы, колгасы, прадпрыемствы).

2. Адзначыць, што за зрыў ліквідацыі няпісьменнасьці поўную адказнасьць нясуць РК КП(б)Б. Даручыць НКА прыцягнуць да адказнасьці інспэктараў п-асьветы Клімавіцкага і Карманскага раёнаў. Адначасова папярэдзіць РК КП(б)Б Магілёўскага, Смалявіцкага, Чавускага, Чырвонапольскага і Быхаўскага раёнаў, аб неабходнасьці ў бліжэйшыя дні дабіцца рашучага пералому ў рабоце па ліквідацыі няпісьменнасьці.

3. Абвязаць усе РК КП(б)Б неадкладна праверыць стан работы па ліквідацыі і забясьпечыць на працягу 2-х дэкаднікаў ліквідацыю прарываў у гэтай справе, ... дзённае кіраўніцтва гэтай работай.

4. Даручыць ЦСПСБ неадкладна праверыць удзел прафсаюзаў у справе ліквідацыі няпісьменнасьці і прыцягнуць да адказнасьці тыя прафарганізацыі, якія ігнаруюць ліквідацыю няпісьменнасьці.

5. Белкоопсаюзу на працягу ... забясьпечыць усе лікпункты і ... лы малалітнейшымі лямпамі, ... крэйдай, сшыткамі, ... чуньні для гэтай мэты асобны ... а таксама ліквідаваць запазычанасьць па ... адпаведныя тэрміны.

Прапанаваць Колгасцэнтру падаць ... насьць т. Мішкова ў двухдзённы ... крайдай указаньне колгасным ... на ліквідацыю прарываў і паг... ным ахопу ўсіх колгасьнікаў ... пунктамі і школамі і вызначыць ... конкрэтныя заданьні колгасам ... справе.

7. ЦК ЛКСМБ мобілізаваць ... усяго комсамолу на барацьбу ... пальную пісьменнасьць і правесьці ... працягу двух дзён вярбоўку ... менш 5000 комсамольцаў для ... срэдняй работы ў лікпунктах.

8. З мэтай зьнішчэньня абязь... стаяраньне сапраўдна ... працы, даручыць НКАсьветы ... ключыць дагаворы з усімі ... цыямі, якія ўдзельнічаюць ... ыі няпісьменнасьці.

9. Ва ўсіх раёнах зараз-жа ... масавы паказ рабочых колгас... каў і працоўных у культурміс... арганізаваць на прадпрыемствах ... новабудоўлях і ЖАКТ'ах ... ныя пункты.

10. Даручыць НКА, ЦСПСБ і ... гасцэнтру забясьпечыць на ўсёй ... ня лікпунктаў і школ правядзе... ваць тэхнічнай і палітычнай ... ццыі, забясьпечыўшы кожны ... пункт асаблівым маркс... армейцам і арганізаваць інструкта... мэтодычную дапамогу ў рабоце ... армейцаў.

11. Разам з барацьбою за паголоўную ліквідацыю няпісьменнасьці ... чыць асноўнай задачай органаў асьветы—барацьбу за якасьць ... чаньня з тым, каб даць навучаю... ся дакладна акрэсьлены аб'ём ... на-адукацыйных і політэхнічных ...

*) Падаецца ў скарочаным выглядзе

Гегель і наша сучаснасьць

С. Вязін

Сотая галавіна сьмерці (XI-1831 г.—XI-1931 г.) вялікага клясыка ідэалістычнай філёзофіі Г. Ф—В. Гегеля сыўпала ў нас з заканчэньнем пляну работ 3-га рашаючага году пяцігодкі, з тым, калі на вялізарнейшых абшарах Савецкага Саюзу завяршаецца фундамант соцыялістычнай экономікі, у той час, калі ў іх, капіталістых усё ўзрастае, паглыбляецца усеагульны крызіс, які абвастрае да адказу ўсе ўнутраныя супярэчнасьці капіталістычнай сыстэмы.

На гэтым фоне зусім становіцца зразумелым і невыпадковым тое, што буржуазія, якая раней „третировала“ філёзофію Гегеля, зараз праяўляе да яе зацікаўленасьць, праводзіць яго ва ўрачыстасьць. Каб высьветліць гэтае пытаньне аб зацікаўленасьці ў гегелеўскай філозофіі—буржуазіі трэба зьвярнуцца да самай гегелеўскай філёзофіі і яе соцыяльнай глебы.

Гегелеўская ідэалістычная філёзофія, ёсьць філёзофія крайне супярэчлівага адзінства паміж дыялектычным рэволюцыйным мэтодам і абсалютнай консэрватыўнай сыстэмай. Гегелеўская сыстэма на ладвае путы на гістарычнае разьвіцьцё грамады, лічыць, што „абсолютны дух“, прайшоўшы ступені чыстай лёгікі, на якіх выявіў свае новыя бакі, альбо самавызначыўся, а потым з галіны чыстай лёгікі „абсолютны дух“ „отчуждает“ сябе ў прыроду, а далей у грамаду і праз шэраг грамадзкіх інстытутаў (сям'ю, рэлігію дзяржаву) у сваім разьвіцьці дайшоў да свайго фінішу—філёзоўскай сыстэмы Гегеля ў якой ён сам пазнае, у якой раскрываецца абсалютная ісьціна. Грамадзкі парадак пры якім раскрыўся абсолютны дух (у часы Гегеля—Пруская манархія) зьяўляецца закончаным і ідэальным парадкам.

Другі бок філёзофіі Гегеля—дыялектычны мэтод, які з завяршэннем руху з статычнай рухузнаходзіцца ў простай процілеглесьці, ён зьяўляецца адбіткам, адлюстраваньнем вечна рухомай матэрыі, ён найбольш поўна, найбольш глыбока і ўсебакова адбівае гэты рух Процілегласьць, якая заложана ў самых рэчах, барацьба гэтых процілегласьцяй, ёсьць корань усякага разьвіцьця, разьвіцьця праз прыжкі, разрывы паступовасьці, рэволюцыю. Гэты бок філёзофіі на ўсё існуючае кладзе пячатку зьмены, старое зьнішчаецца новым і разьвіваецца па „спиралеобразному“ напрамку.

Рэзюмуем сказанае наступнымі радкамі з Энгельса: „Гегелеўская сыстэма, як гэтакая, была вялізарным неданоскам, але і апошнім у сваім родзе. Яна хварэла, звыш таго, (звыш ідэалізму. С. В.) нявырашальнай унутранай супярэчнасьцю: з аднаго боку асноўнай прадпасылкай сыстэмы зьяўляецца гістарычны погляд, што прызнае чалавечую гісторыю процэсам, які разьвіваецца і які па самой сваёй прыродзе ня можа завяршыцца ў інтэлектуальнай сфэры адкрыцьцем т. зв. абсолютнай ісьціны, але з другога боку, сама сыстэма протэндуе, што ў ёй зьмяшчаецца гэтая ісьціна. Усеаб'емлючая, раз назаўжды ўстаноўленая сыстэма па зведах прырод і гісторыі супярэчыць асноўным законам дыялектычнага мысьленьня... (Анты-Дзюрынг, ст. 5)“.

Такую фізіолёгію парадзілі соцыяльна-экономічныя ўмовы таго часнай Нямеччыны: экономічная адсталасьць і політычная раздробленасьць краіны, політычная кволасьць самой буржуазіі для барацьбы з фэодалізмам і адначасова патрэба гэтай барацьбы з ім для разьвіцьця капіталістычных прастораў. Гэта дапаўнялася яшчэ тым, што Нямеччына знаходзілася паміж яшчэ больш экономічна адсталым і рэакцыйным тагочасным Усходам з аднаго боку і экономічна перадавым і рэволюцыйным тагочасным Захадам—з другога боку.

Такая соцыяльная экономічная глеба і парадзіла філёзофію Гегеля і знайшла ў ёй свой геніяльны адбітак з рэволюцыйнымі імкненьнямі буржуазіі, з прымірэнцтвам той-жа буржуазіі да фэўдальнай рэчаіснасьці. Калі дапусьціць гістарычнае параўнаньне дык у сыстэме Гегеля адбілася рэчаіснасьць Нямеччыны пачатку XIX века як у Л. Таўстога—расійская рэчаіснасьць канца XIX веку з іх супярэчнасьцямі.

Спадчыну Гегеля мы не проста асвоілі так, як яна дасталася, а крытычна пераапрацавалі. Клясычныя ўзоры крытычнай пераапрацоўкі гегелеўскай філёзофіі даюць самі настаўнікі пролетарыяту.

„Мой дыялектычны мэтод—піша Маркс, у „послесловии“ да другога выданьня першага тому „Капітала“—ня толькі ў корні розьніцца ад гегелеўскага, але ўяўляе яго простую процілегласьць. Для Гегеля процэс мысьлі, які ён пад назвай ідэі ператварае нават у самастойны суб'ект, ёсьць дэміўрг (творца) рэчаіснасьці, якая ўяўляе толькі яго вонкавае праяўленьне. Для мяне наадварот, ідэальнае ёсьць нішто іншае, як пераведзенае і перапрацаванае ў чалавечай галаве матэрыяльнае.

Містыфікуючы бок гегелеўскай дыялектыкі я падпарадкаваў крытыцы амаль 30 год таму назад (пісаў у 1873 годзе С. В.) у той час, як яна была яшчэ ў модзе. Тая містыфікацыя, якую працярпела дыялектыка ў руках Гегеля, зусім не перашкодзіла таму, што менавіта Гегель першы даў вычарпальны і сьвядомы малюнак яе агульных форм руху. У Гегеля дыялектыка стаіць на галаве. Трэба яе паставіць на ногі, каб ускрыць рацыянальнае зерня пад містычнай абалонкай.“

Ленін у сваім „Конспэкце“ на лёгіку Гегеля ўсьлед за Марксам паказаў як патрэбна крытычна адносіцца да Гегеля, як з містычнай шалухі вылушчваць „рацыянальныя зерні“ і разьвіў марксавую думку, аб гегелеўскай „картине общих форм движения“ далей:

„Лёгіка. — заззачае Ленін,—ёсьць вучэньне аб вонкавых формах мысьленьня, аб законах разьвіцьця „усіх матар'яльных, прыродных і духоўных рэчаў“, — гэта значыць разьвіцьця ўсяго конкрэтнага зьместу сьвета і пазнаньне яго, гэта зн. вынік сумы, вывад гісторыі пазнаньня сьвету“ (IX Ленінскі зборнік, ст. 41).

Клясыкі **марксызму** паказалі шлях, па якім павінны ісьці крытычная пераапрацоўка гегелеўскай філёзофіі, асабліва закону пазнаньня —дыялектыкі. Яна павінна ісьці па лініі вылушэньня з містычнай шалухі гносіолёгічных зерняў і пастаноўкі іх на ногі па лініі крытыкі ідэалізму і папоўшчыны, па лініі раскрыцьця ўнутраных супярэчнасьцяй і аднабаковасьці яго сыстэмы, па лініі паказу клясавай прыроды яго філёзофіі. Гістарычнага падыходу, па лініі матэрыялістычнай пераапрацоўкі гегелеўскай спадчыны, падпарадкаваўшы гэтую работу справе распрацоўкі матэрыялістычнай дыялектыкі, як больш шырэйшай і глыбейшай задачы.

Маркс і Энгельс паступілі з гегелеўскай дыялектыкай ня так, як гэта зрабіў Л. Феербах, а крытычна пераапрацавалі, зьмянілі адыходны пункт сыстэмы, пераглядзелі арсэнал гегелеўскіх катэгорый і г. д., чым абагацілі дыялектычны матэрыялізм. У выніку такой працы над нямецкай філёзофіяй (у прыватнасьці—Гегеля), англійскай політычнай экономіяй і французкім соцыялізмам, марксызм ... вучэньне стала ўсебаковым, стройным і цэльным, яно стала навукай пролетарыяту, навукай ня догмы, а навукай дзеяньня для зьмены грамадзкіх адносін, для зьнішчэньня эксплёатацыі чалавека чалавекам.

Ленінізм зьяўляецца далейшай распрацоўкай марксізму ў эпоху імперыялізм і пролетарскіх рэволюцый. Марксызм-Ленінізм прадстаўляе вышэйшую ступень у разьвіцьці пазнаньня прыроды, грамады і мысьленьня. УсеКП(б) і т. Сталін, карыстаючыся матэрыялістычнай дыялектыкай Маркса-Леніна прывялі рабочую клясу да перамогі на фронце індустрыялізацыі краіны, на фронце колектывізацыі сельскай гаспадаркі і ліквідацыі кулацтва як клясы, на фронце культурнай рэволюцыі.

Вывучэньне прац Маркса, Энгельса, Леніна, Сталіна і пастаноў Комінтэрну і ЦК дае правільнае разуменьне матэрыялістычнай дыялектыкі.

УсеКП(б) і КІ зьяўляюцца адзінымі насьбітамі дыялектычнага матэрыялізму і яго далейшымі распрацоўшчыкамі. Усякае ўхіленьне ад вызначанай імі лініі, есьць ухіленьне ад дыялектычнага матэрыялізму. Барацьба за генэральную лінію партыі, барацьба з мэханіцызмам, як галоўнай небясьпекай у сучасны момант, які праводзіць рэвізію марксізму-ленінізму і зьяўляецца мэтодалёгіяй правага ўхілу, з меншавісцтвуючым ідэалізмам і ёсьць барацьба за дыялектычны матэрыялізм.

Фашыстыя і соцыял-фашыстыя—героі інтэрвэнцыі супроць СССР галавіну сьмерці вялікага ідэалістага праводзяць пад лёзунгамі барацьбы з рэволюцыйным рухам, барацьбы з тэорыяй пролетарыяту—дыялектычным матэрыялізмам. Яны с тойжа мэтай прымірэнчы, консэрватыўны і рэакцыйны бок гегелеўскай філёзофіі яднаюць з дуалістычнай і компраміснай філёзофіяй Канта.

Мы павінны скарыстаць гэтую галавіну для популярызацыі сярод рабочых і колгасьнікаў дыялектычнага матэрыялізму Маркса-Леніна, для стварэньня пастаноўкі матэрыялістычнай дыялектыкі на службу соцбудаўніцтва

За ўдарную рэалізацыю пастаноў пленуму
(Рэйд брыгад „Ч. З.“)

Больш увагі адкормачным пунктам

100 проц. выкарыстаньне гарбэджу павінна стаць задачай усёй комсамоліі

ЦК УсеЛКСМ ў сваёй пастанове, па рэалізацыі пастаноў Кастрычніцкага пленуму ЦК УсеКП(б), высунуў, як адзін з мэтодаў барацьбы комсамолу за палепшаньне грамадзкага харчаваньня—барацьбу за рацыянальнае выкарыстаньне гарбэджу сталовых і організацыю адкормачных пунктаў пры іх.

Гэта яскравая, выразная дырэктыва ЦК не знайшла дагэтуль адбітку шырокім шэрагу комсамольскіх організацый.

З мэтай хутчэй рэалізаваць пастановы пленуму ЦК УсеКП(б) і УсеЛКСМ, газэта „Чырвоная Зьмена“ абвяшчае паход комсамолу за поўнае выкарыстаньне гарбэджу, за організацыю пры кожнай сталовай, як фабрычна-заводзкай, так і агульнай, адкормачнага пункту.

Комсамолія Беларусі павінна неадкладна ўключыцца ў гэты паход і прыняць у ім самы актыўны ўдзел.

Каштоўныя адкіды—ідуць к прыватніку

Сталоўка шчотачнай фабрыкі (Менск) абедзе больш 800 рабочых. Шмат астаткаў застаецца ад кухні і абедаў.

Усе гэтыя адкіды за мізэрную плату аддаюцца хатнім гаспадыням, замест скарыставаць іх на сваім адкормачным пункце, а такі дагэтуль на фабрыцы не організаваны. Сталоўка зараз купляе мяса на рынку і плаціць за кілё 5 рублёў—мясны абед каштуе рабочаму 65 кап.

Партыйны колектыў, высухаўшы інформацыю намзагадчыка аб працы сталоўкі, прапанаваў зараз-жа організаваць адкормачны пункт, забясьпечыўшы яго патрэбнай колькасьцю сьвіней.

Адміністрацыя сталоўкі „Настараса“ выканала пастанову партыйнага колектыву: купіла 5 хворых парасят, з якіх праз пару дзён 2 здохла, а астатніх адправілі на бойню.

Комсамольскі колектыў і пальцам не пашавяліў, каб організаваць і наладзіць працу адкормачнага пункту. Сакратар колектыву т. Мароз, дае кароткі адказ: „За мае 2-хмесячнае сакратарства пытаньне аб гарбэджы на бюро ня ставілася.

Пры правільным скарыстаньні гарбэджу ў адкормачным пункце і добрай пастаноўцы працы можна было гадаваць ня менш 30 сьвіней. А гэта значыць—значна палепшыць харчаваньне рабочых.

Колектыву ЛКСМБ зараз-жа неабходна ўзяцца за організацыю адкормачнага пункту на фабрыцы. Трэба выправіць вялізарную памылку, калі каштоўныя адкіды ішлі к прыватнікам.

Брыгада „ЧЗ“ Сабалеўскі, Корань, Пракапеня.

Падтрымаць ініцыятыву

У сталоўку фабрыкі 8-га сакавіка (Менск) абеды прывазілі з кухні-разьмеркавальніка. Шмат каштоўных адкідаў сталоўкі дагэтуль прадавалі па 50 кап. за вядро.

Зараз адчынілі на фабрыцы сваю кухню. Комсамольскі колектыў узяў на сябе абавязак ліквідаваць нерацыянальнае скарыстаньне гарбэджу. Сакратару комсамольскай ячэйкі закройнага цэху даручана організаваць пры фабрыцы адкормачны пункт. Ужо пабудавалі добра абсталяваны, цёплы сьвінарнік. Выехала брыгада закупіць сьвіней.

На першы пачатак рашылі закупіць 16 сьвіней, пазьней давесьці гурт да 70 штук.

Ініцыятыва комсамоліі фабрыкі 8-га сакавіка павінна быць падхоплена ўсімі астатнімі комсамольскімі організацыямі БССР.

Брыгада „Ч. З.“ Кавалевіч, Варэнік.

За правільную організацыю адкормачных пунктаў

Пры сталовай швейнай фабрыкі „Кастрычнік“ організован адкормачны пункт. 48 падсьвінкаў і 18 старых сьвіней знаходзяцца ў добрым і сьветлым сьвінарніку. На днях будзе скончан новы сьвінарнік на 100 галоў.

Трэба адзначыць, што комсамольскі колектыў не зьвяртае ўвагі на працу адкормачнага пункту. Калі мы запыталі ў сакратара колектыву т. Марошак, аб стане сьвінарніку і аб тым, што зрабіў комсамол для палепшаньня яго, пасьля некаторай паўзы адказала:—„нічога...“

Так далей быць ня можа. Комсамольскі колектыў фабрыкі „Кастрычнік“ павінен паставіць перад сабой задачу: рацыянальна выкарыстоўваць гарбэдж сталоўкі.

Пракапеня, Корань, Сабалеўскі.

„Мы лічым непатрэбным займацца гэтым пытаньнем“

Комсамольцы заводу „Комунар“ зусім не цікавяцца тым, як працуе адкормачны пункт пры заводзкай сталоўцы, якія ёсьць недахопы ў яго працы.

Што зрабіў комсамол для палепшаньня працы адкормачнага пункту? На гэта выразна адказвае сакратар комсамольскага колектыву: „Мы на ставілі гэтага пытаньня і ня думаем ставіць“.

Комсамол заводу „Комунар“ стаіць у баку ад выкананьня рашэньняў пленуму ЦК УсеКП(б) аб рацыянальным скарыстаньні гарбэджу.

Брыгадзіры „Ч. З.“ П-ё і М-к.

Сьвіньні гразь не паважаюць

У адкормачным пункце сталоўкі абутковай фабрыкі (Менск) гадуюцца 20 сьвіней. Корм імя атрымоўваюць добры, але нікуды не варта абсталяваньне сьвінаркі. Толькі ў адным з іх ёсьць падлога, а ў астатніх сьвіньні па вушы качаюцца ў гразі.

Сакратар колектыву не ведае навет колькі ўсіх сьвіней у адкормачным пункце.

Комсамольскаму колектыву неабходна зараз-жа ўзяцца за палепшаньне добрых сьвінарнікаў.

Брыгадзіры Я.-К Пр-ня С-кі.

Сьвіньні патрабуюць да сябе ўвагі

Комсамольская організацыя заводу „Бальшавік“ (Менск) мала цікавіцца станам [illegible] адкормачнага пункту пры заводзкай сталовай.

У адкормачным пункце 36 сьвіней. Сьвінарнікі не ў дастатковай меры асьветлены і ацеплены. Нярэдкі выпадак, што сьвіньні хварэюць.

Комсамольскі колектыў усё гэта бачыць, але чамусьці не рэагуе.

Брыгада „Ч. З.“
Мазанік, Крывіца

Да партнарады па мастацтву

У бойках за прамфінплян

(Нататка юніораў)

Ужо каля 3-х месяцаў, як у Віцебску працуе Дзяржаўны Яўрэйскі Тэатр Беларусі. Віцебску тэатр ужо знаёмы па яго ранейшых пастаноўках у 1928 годзе. За гэты час тэатр у значнай ступені ўмацаваўся і ідэйна ўрос. Яго сучасны рэпэртуар паказвае, што тэатр стаіць на цьвёрдым шляху да пролетарскага мастацтва.

Тэатр абагаціўся новым рэпэртуарам: „Сталь“ („поэма аб гапары“), Н. Пагодзіна, „Стрэл“—Безыменскага, „На 62 участку“—Дабр шыза, „Джым Куперкоп“, „Глухі“ і г. д. Усе гэтыя матар'ял, з якім працуе тэатр у значнай ступені ўзначае яго кірунак.

Але было-б памылкова, калі-б тэатр абмяжаваў сваю дзейнасьць выключна пастаноўкай п'ес, ня прымаючы непасрэднага ўдзелу ў напружанай барацьбе пролетарыяту за выкананьне і перавыкананьне плянаў.

Тэатр кінуў усе свае сілы і здольнасьці на фабрыкі, заводы, ў колгасы для таго, каб сілай мастацкага слова дапамагчы выконваць вялікія пляны, вывучаць і натхняць герояў пяцігодкі змагароў пяцігодкі. Для гэтай мэты тэатрам організаваны спэцыяльныя брыгады, якія баруць матар'ял з жыцьця таго ці іншага прадпрыемства, мастацкі яго афармляюць і потым даюць паказы на фабрыках і заводах.

У Віцебску тэатр вылучыў 4 брыгады, прымацаваўшы іх да фабрыкі „Сьцяг Індустрыялізацыі“, акулярнай, імя Лекерта і заводу „Чырвоны Металісты“. Задача гэтых брыгад—дапамагчы ўзьняцьцю культмасавай работы, праводзеньню ў жыцьцё новых форм і мэтодаў культр боты. На фабрыцы „Сьцяг Індустрыялізацыі“—шэфу тэатру—брыгада фабрыкі і тэатру выпрацавалі конкрэтныя пляны работы.

Праведзены рад гутарак у цэхах. Наладжана 2 выпуску ленгазэты. Адно абслугоўваньне на мясцовым матар'яле і другое концэрт у часе рэлігійных сьвят.

На „Чырвоным Металісьце“ брыгада організавала чырвоныя куткі ў цэхах. Праведзены сумесна з брыгадай акулярнай фабрыкі аб'яднаны вечар у клюбе металістых. На акулярнай фабрыцы організаваны культройкі па цэхах для перабудовы культработы. Праведзены 4 гутаркі аб антысэмітызьме ў сувязі з праявамі апошняга на фабрыцы. Рэорганізавана чытальня. Праведзена мастацкая чытка літаратуры.

Такі шлях збліжэньня тэатру са сваім рабочым гледачом у значнай меры ўзьнімае работу тэатру на вышэйшую ступень і разам з тым дапамае прадпрыемствам выконваць свой прамфінплян.

Бязумоўна, дасягненьні тэатру вялікія. Аб гэтым яскрава сьведчаць яго пастаноўкі. Каб у гэтым пераканацца, трэба пагледзець пастаноўку „Стрэл“ Безыменскага. Едкая сатыра, узяўшая пад абстрэл бюрократызм, опортунізм, комчванства і скурніцтва, падана з асаблівай мастацкай меткасьцю і завостранасьцю. Асабліва трэба адзначыць мастацкае афармленьне п'есы. Кожная дэталь пастаноўкі мастацка апрацавана, акрэсьлена. Пастаноўка дасягае вялізарных посьпехаў.

П'еса „Ботвін“—адна з слаўтых п'ес рэпэртуару тэатру. Гэтая п'еса прагледжана амаль усім яўрэйскім насельніцтвам Віцебску.

Беларускі яўрэйскі тэатр аказвае пролетарыяту Віцебску вялікую дапамогу ў барацьбе за выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну.

Юнкоры „Ч. З.“ З. Ваўчок, Д. Усыскін, З. Капыскі, Л. Лісаў, В. Азёрны і Гурэвіч.

Белдзяржкіно зрывае падрыхтоўку кадроў

14-га кастрычніка паводле заключанага дагавору, нас 4 студэнтаў Ленінградзкага Інстытуту Інжынэраў Гукавога Кіно прыбыло у распараджэньне Белдзяржкіно для праходжаньня вытворчай практыкі. Тут нас сустрэла поўная перазьбярыха.

Першыя 14 дзён месца практыкі зусім не адпавядалі програмам. І толькі 19 кастрычніка, хутчэй, каб пазбавіцца ад нас, а не для таго, каб прадаставіць неабходную практыку, нас разаслалі ў аддзяленьні Белдзяржкіно. „Вы наогул нам непатрэбны, дагавор нас навязаны“—так заявіў нам член праўленьня т. Матусаў.

Пастановы ЦВК і СНК аб СССР аб аплаце практыкантаў для Белдзяржкіно таксама не існуе.

Закончыўшы практыку у аддзяленьнях, мы зьвярнуліся ўжо да новага заг. аддзелам кадраў т. Альтшуля з прапановай заладзіць вытворчую нараду для абмалёўкі выяўленых намі недахопаў у рабоце аддзяленьняў. „Напішэце аб усім на паперы, у нас зараз няма часу, мы заняты організацыяй кінотэхнікуму у Віцебску“—пасьледваў адказ заг. аддзелам кадраў. Аднак, нас гэта не асабліва зьдзівіла.

Не адстае ў адносінах да практыкантаў і заг. рамонтнай майстэрні Мендзяржкіно т. Фрыд. У часе спрэчак па тэхнічнаму пытаньню т. Фрыд лічыць нормальным абзываць практыканта „заблытаным у у тэорыі“, „вар'ятам“ і г. д.. ня гледзячы на тое, што ў выніку спрэчак сам прызнаў сябе на правым. На просьбу практыканткі даць ёй працу, т. Фрыд адказвае: „работы ў мяне для вас няма, а прыбіральніц мне непатрэбна“. Прапанова практыканта купіць альбо зрабіць запасную колькасьць болтоў, для „предохранителей“, якія паскорваюць працэс мантажа электроразьмеркавальных шчытоў, таксама не пакінута без „увагі“ т. Фрыда: „Не ўказвай мне“, „не перашкаджай працаваць“, „выйдзі прэч з майстэрні“.

Гэта не адзінкавыя выпадкі. Іх надзвычайна шмат. Аднак, і яны яскрава сьведчаць, як Белдзяржкіно выконвае дырэктывы партыі, як Белдзяржкіно вырашае пытаньне падрыхтоўкі кадраў.

Брыгада практыкантаў Гольштэйн Ефімаў, Недробава, Шапіра.

Е Хэйман

Шырэй крок у паходзе

Комсамольская організацыя Менску ўключылася ў сталінскі паход, пад якім быў праведзен па Менску вытворчы паход.

Перадавыя колектывы „Бальшавік“, „Комунар“, „Вárашывала“—дабіліся, што цэнтрам работы стала ўжо комсамольская група ў вытворчай брыгадзе. Ёсьць прыклады, што групы выпрацоўваюць асабліва каштоўныя формы мобілізацыі рабочай масы на выкананьне прамфінпляну. Комсамольскія групы на заводзе „Бальшавік“ высунулі такую форму: кожны дзень да гудка праводзіць дзесяціхвілінныя нарады аб зьменна-сустрэчных плянах. Комсамольскія групоргі раду прадпрыемстваў дабіліся сапраўды ўдарнага выкананьня прамфінпляну.

Брыгада рамшчыкаў першага цэху, заводу „Бальшавік“, выканала прамфінплян на 115 проц., комсамольцы-ж гэтай брыгады прамфінплян выконваюць на 122 проц.

Комсамольскія брыгады амаль ва ўсіх прадпрыемствах ідуць першымі ў выкананьні прамфінпляну. Гаспрахунковая комсамольская брыгада кувыркоў заводу „Комунар“ прамфінплян выканала за кастрычнік на 138 проц. і поўнасьцю спыніла брак. Брыгада адліўшчыкаў ф-кі „Комунарка“ на чале з брыгадзірам т. Фрысманам прамфінплян за 3-ці квартал выканала на 160 проц. Такіх прыкладаў можна прывесьці шмат.

Аднак, яшчэ ёсьць рад недахопаў. Напрыклад, пераход на функцыянальную сыстэму ў цэх'ячэйках зрывае самастойнасьць у працы і кіраўніцтве цэх.яч. усім жыцьцём цэху, з аднаго боку, і працу функцыянэраў у брыгадах—з другога. Перабудова павінна забясьпечыць галоўным чынам працу комсамольскіх груп: поўную самастойнасьць і ініцыятыву цэх'ячэек КСМ.

Цэх'ячэйка павінна дапамагаць і кіраваць працай груп, высоўваць перад імі задачы, якія-б забясьпечылі чоткую работу ў брыгадзе.

Сталінскі паход павінен стаць магутным рычагом для адстаючых у выкананьні прамфінпляну колектываў.

Колектывы Аўтотрамтрэсту, якія выканалі плян асеньне-зімовых перавозак на 5 проц., колектывы фабрыкі „Усход“, заводу „Ударнік“ і рад іншых павінны прыняць усе захады, каб у выніку сталінскага паходу іхныя прадпрыемствы поўнасьцю выканалі свой прамфінплян.

Комсамольская організацыя Менску павінна павысіць ўдзел комсамолу ў барацьбе за палепшаньне культбытавых умоў работы, за разгортваньне соцспаборніцтва і ўдарніцтва паміж ЖАКТамі на лепшае абслугоўваньне рабочых. у барацьбе за чыстую кватэру, за чысты двор і вуліцу. Гэта — справа кожнага комсамольца. Мы яшчэ вельмі мала зрабілі для палепшаньня работы ЗРК і сталовых.

Для перадачы вопыту лепшай работы комсамольскіх колектываў і ячэек па рэалізацыі 6 умоў т. Сталіна і надцягваньня адстаючых колектываў, па Менску будзе праведзена комсамольская эстафэта. Комсамольскія колектывы „Комунара“, „Бальшавіка“ і інш. павінны ўзяць пад свой нагляд аднародныя прадпрыемствы і дапамагчы адстаючым колектывам.

Скразны конвэер якасьці і самакантроль за якасьцю продукцыі трэба пусьціць у ход. Швейнікі і абутнікі, гэта залежыць ад вашай ініцыятывы. Больш упартай работы! Бо якасьць продукцыі швейнай і абутковай прамысловасьці ўсё яшчэ адстае.

Комсамол чыгункі абавязан зараз-жа падрыхтаваць шчыты для ачысткі і аховы дарог ад заносаў. Сталінскі паход павінен адзначыцца поўным пераходам на спаранную язду.

Вельмі слабы яшчэ ўдзел вясковых ячэек КСМ Менскага раёну ў рэалізацыі 6 умоў т. Сталіна.

Саўгасы „Вішнёўка“ „1-га мая“ „Горкі“—сьвінаводчыя гіганты нашага раёну—павінны ўключыцца ў сталінскі паход, Комсамолія гэтых саўгасаў яшчэ з большай самаадданасьцю павінна змагацца за „тону-апарос“, прыняць шэфства над сьвінарнікамі. перанесьці цэнтр увагі ў аддзяленьні і паасобныя сьвінарнікі.

Комсамол колгасаў павінен скарыстаць сталінскі паход для яшчэ большай мобілізацыі комсамольцаў на організацыйна-гаспадарчае замацаваньне колгасаў, на шырокае разгортваньне соцыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва. Зараз-жа праверыць плян нарыхтовак у колгасах, канчаткова ліквідаваць абязьлічку і ўраўнілаўку у саўгасах, правільна разьмеркаваць прыбыткі і ўраджай у колгасах.

Толькі своечасовае і правільнае разьмеркаваньне даходаў у колгасах заматуе зьдзельшчыну, узьніме продукцыйнасьць працы, павялічыць таварнасьць колгаснай гаспадаркі.

Мы павінны змагацца за тэмпы і замацаваньне росту, за ініцыятыўны комсамол.

У ПАНСКАЙ ПОЛЬШЧЫ НЕ ХАПАЕ КАЗЭМАТАЎ

Бязупынна расьце колькасьць зьняволеных

ВАРШАВА. 30. Па дадзеных міністэрства юстыцыі, колькасьць турэмных зьняволеных у Польшчы бязупынна павялічваецца і на першае лістапада гэтага году складала 63917 чал. Колькасьць зьняволеных за апошнія 2 гады павялічылася амаль на 20 проц. У выніку гэтага не хапае месц ня толькі ў старых турмах, якія засталіся ад былога царскага аўстрыйскага і нямецкага ўраду, а таксама і у новых турмах, пабудаваных ужо Польшчай.

„Перанасяленьне турмаў зараз нагэтульві вяліклае,—піша „Газэта Варшаўска“,—што можа ўзьнікнуць неабходнасьць пабудоў новых турмаў“.

Рабочыя папярэджаны аб звальненьні

ВАРШАВА. 30 „Экспрэс поранны“ паведамляе, што ўсе буйныя тэкстыльныя фабрыканты Лодзі пастанавілі ў зьвязку з цяжкім крызісам зачыніць свае прадпрыемствы на 1 месяц (з 15 сьнежня 1931 г. па 15 студзеня 1932 г.) Рабочыя ўжо папярэджаны аб звальненьні.

Распачалася забастоўка 7000 рабочых

ВАРШАВА. 30. „Экспрэс поранны“ паведамляе, што ў Лодзі выбухла забастоўка 7 тысяч рабочых у зьвязку з адмаўленьнем прадпрымцаў падпісаць колдагавор. Па весткам гэтай-жа газэты, забастоўка 5 тысяч рабочых шоўкавае прамысловасьці, якая працягвалася 5 тыдняў, набліжаецца к канцу, бо прадпрымцы на нарадзе з інспэктарам працы згадзіліся на павышэньне зарплаты.

Дзесяткі вырастуць у сотні, сотні—у тысячы



Карта галоўных пунктаў і шляхоў вялікага „галоднага паходу“ амэрыканскіх рабочых і беспрацоўных у Вашынгтон.

Паход гэты распачынецца ў першых лічбах сьнежня. З усіх бакоў краіны напіраюцца калёны беспрацоўных. Спыняючыся ў вызначаных пунктах, яны будуць выступаць на конфэрэнцыях і масавых сходах дэлегатаў. Дэлегаты накіроўваюцца далей. Да іх будуць далучацца новыя. Дзесяткі вырастуць у сотні, сотні—у тысячы. І да 7-га сьнежня, у дзень, калі ў Вашынгтоне адчыніцца чарговая сэсія конгрэсу, туды ўступяць шматлікія калёны рабочых, якія прадстаўляюць 40 мілі. працоўнага насяльніцтва ПАЗШ—мужчын, жанчын і дзяцей, кінутых капіталізмам у бязодняе безвыхаднай галечы, голаду і выміраньня.

Атрады „галоднага паходу“ накіроўваюцца ў Вашынгтон

Буржуазны друк выказвае трывогу

НЬЮ-ЁРК 30. Атрады „галоднага паходу“ беспрацоўных з усіх канцоў краіны накіроўваюцца ў Вашынгтон. Паход спадарожнічаецца масавымі дэманстрацыямі ў буйнейшых прамысловых цэнтрах. Па меры набліжэньня да Вашынгтону лік удзельнікаў „галоднага паходу“ усё ўзрастае. Вашынгтонская раённыя паліцыя, у паведамленьні перададзеным у друк, сьцьвярджае, што „галодны паход“ зьяўляецца вынікам „комуністычнай зловы, і фінансуецца з невядомых крыніц“, саправды-ж паход быў організаваны на пастанове агрэмадзкай колькасьці публічных мітынгаў і конфэрэнцый, якія адбыліся на ўсёй краіне.

Буржуазны друк публікуе паведамленьне аб паходзе беспрацоўных пад усялякімі трывожнымі загалоўкамі. Вашынгтонскі ўрад узмацняе ахову белага дому (рэзыдэнцыя прэзыдэнта).

Сацыял-фашыстыя адчынена патрабуюць калёнізацыі Афрыкі

БЭРЛІН 30. У Кельне адбыўся вечар калёніяльнай палітыкі, які зноў паказаў наколькі цесна зрасьліся с.-д. лідары з кіраўніцтвам нямецкага фашызму. Дакладчыкамі на вечары выступілі: член дзяржаўнага эканамічнага савету соцыял-дэмократ Коган—Ройе і былы прэзыдэнт рэйхсбанку нацыяналісты Шахт.

Соцыял-фашысты Коган адкрыта патрабаваў калёнізацыі Афрыкі ў інтарэсах эўропэйскага імпэрыялізму. Ён заявіў, што Эўропа яшчэ здольна аздаравіць сваё становішча, калі яна рашыцца на супрацоўніцтва, каб супольна зрабіць прасторнейшую калёнію сьвету—Афрыку—у калёнію эўропэйскага контынэнту.

Далей Коган адзначыў, што ніхто не сумняваўся ў тым, што Нямеччына ня менш іншых краін здольна да колёніяльнай дзейнасьці. Выступіўшы пасьля яго Шахт падзякаваў Когана за яго прамову, заявіўшы, што яму няма чаго дадаваць.

ПАСТАНОВА

Сэкратарыяту ЦК ЛКСМБ аб уключэньні ў абвешчаны газэтай „Праўда“ конкурс на організацыйна-гаспадарчаму ўмацаваньню колгасаў

1. Прапанаваць усім РК і ячэйкам ЛКСМБ зараз-жа ўключыць усіх комсамольцаў і працоўную моладзь ў конкурс. Правесьці раённыя зьлёты юнкораў па гэтаму пытаньню, каб узмацніць работу комсамольскай організацыі сярод юнкораў у галіне выкананьня рашэньняў 2-га Ўсебеларускага зьезду рабселькораў.

2. Прапанаваць усім маладзёжным і дзіцячым газэтам забясьпечыць практычны ўдзел у конкурсе, вылучыўшы ва ўсе газэты адказных за гэту працу.

МЕРАПРЫЕМСТВЫ

рэдакцыі „Чырвонай Зьмены“ і Менгаркому ЛКСМБ па разгортваньню масавай работы сярод юнкораў і палепшаньню работы нізавога друку

Што і дзе праводзіцца	Хто праводзіць	Тэма	Час правядзеньня
1. Зьлёт—„Полымя рэвалюцыі.	Шапіра, Тарлоўскі	Стан рамонту паравозаў, зарплата і ліквідацыя абязьлічкі.	9-XII
2. Зьлёт—МББ цягі.	Шапіра, Тарлоўскі	Аб выкарыстаньні наяўнага парку, стане, спаранай язды і пагрузачна-разгрузачных работ.	10-XII
3. Зьлёт — „Варашылава“, „Комунар“, „Ударнік“.	Плашчынскі, Бэнэнсон	Стан плянаваньня, аўладаньне тэхнікай і рацыяналізацыяй.	9-XII
4. Зьлёт — „Бальшавік“, абутковая „Усход“, лямцавая і шчотачная.	Фіялкін, Гурэвіч	Аўладаньне тэхнікай, тэхвучоба і карантын.	10-XII
5. Зьлёт — „Кастрычнік“, „8-га сакавіка“, „Крупскай“, „Чырвоны тэкстыльшчык“ і ФЗВ імя КІМ.	Казлоў, Куніна	Гаспадарчы разрахунак, якасьць і зьніжэньне сабекошту.	10-XII
6. Зьлёт — Сярэдніх навучальных установы.	Плашчынскі, Садоўскі	За соцыялістычныя кадры і ўдзел у сталінскім паходзе.	14-XII
7. Зьлёт — Белдзяржбуд, Менбуд, Валенбуд і ВЖС.	Глезер, Катков	Стан капітальнага будаўніцтва і падрыхтоўка да новага сэзону.	14-XII
8. Сход комсамольцаў-юнкораў у жактах №№ 20, 35, 17, 10, 12.	Вярнікоўскі, Гурэвіч	Сан.-мінімум і ахова дамоў ад разбурэньня.	14-XII
9. Нарада комсамольцаў, якія працуюць у праўленьні жактаў, жылстале і гаржылсаюзе, з старшынямі жактаў.	Вярнікоўскі, Дардык	Намётка конкрэтных мерапрыемстваў па рэалізацыі пастановы ЦК і СНК аб капітальным будаўніцтве.	19-XII
10. Нарада комсамольцаў трамвайнага парку і лініі гарадзкой чыг. і трэсту.	Тарлоўскі, Казлоў	Барацьба з чаргамі, нагрузкай, выкарыстаньнем наяўнага складу вагонаў.	14-XII
11. Нарада маладых кухароў.	Давыдава, Фельдман	Добраякасны абед рабочаму і мерапрыемствы па выкарыстаньню гарбэджу.	10-XII
12. Нарада ўпаўнаважаных друку.	Казлоў, Гурэвіч	Стан работы па распаўсюджваньню маладзёжнага друку.	20-XII
13. Нарада загадчыкаў маладзёжных старонак, шматтыражак і насьценгазэт сумесна з комсамольцамі і членамі рэдкалегій газэт.	Казлоў, Фруміна	Стан работы маладзёжных старонак і далейшыя задачы па ўдзелу ў конкурсе „Праўды“ і сталінскім паходзе.	6-XII
14. Нарада рэдактароў, сэкратароў і членаў рэдкалегій шматтыражак, штодзёнак і насьценгазэт у сувязі з конкурсам.	Дамарацкі, і загадчык васковага сэктару Менгаркому	Гаспадарчае ўмацаваньне колгасаў і задачы нізавога друку.	20-XII
15. Агульна-гарадзкая конфэрэнцыя юнкораў рэдактароў, сэкратароў, членаў рэдкалегій (комсамольцаў) шматтыражак, штодзёнак і насьценгазэт.	Менгарком і рэдакцыя „ЧЗ“	1. Папярэднія вынікі ўдзелу ў сталінскім паходзе юнкораў і нізавога друку. 2. Папярэднія вынікі ўдзелу юнкораў і нізавога друку ў конкурсе „Праўды“.	25-XII

Усю работу закончыць не пазьней 25-га сьнежня, пасьля чаго праверыць і падвесьці вынікі.

Компартыя кліча на абарону Савецкага Саюзу, кітайскіх саветаў

З адозвы ЦК компартыі Кітаю

БЭРЛІН. Атрымана адозва ЦК компартыі Кітаю з повадү захвату японскім імпэрыялізмам Манчжурыі. Адозва ўказвае, што дзеяньне японскіх мілітарыстых у Манчжурыі зьяўляецца неабвяргальным довадам таго, што японскі імпэрыялізм хоча зрабіць у Манчжурыі сваю колёнію. Рабочыя, сяляне, салдаты, студэнты і ўсе працоўныя пласты ўсяго Кітаю бясконца абураны нахабным разбойніцкім паходам японскага імпэрыялізму.

Далей адозва выкрывае хлусьлівы гоміданаўскі лёзунг „нацыянальнага адзінага фронту“, які служыць Гоміндану для разгорнутай барацьбы супроць рэволюцыйных шырокіх мас працоўных і ўказвае, што пад шыльдай нацыянальных лёзунгаў гоміндан вядзе гандаль з імпэрыялістамі і прадае ім інтарэсы кітайскага народу з тым, каб атрымаць ад імпэрыялістых дапамогу ў барацьбе супроць рэволюцыйнага руху ў Кітаі, які ўсё ўзрастае.

Гоміндан,—пішацца далей ў адозьве—разам з імпэрыялістычнымі краінамі карыстаецца нападам японскіх імпэрыялістых для таго, каб весьці траўлю супроць Савецкага Саюзу—бацькаўшчыны ўсіх працоўных усяго сьвету. Адозва заклікае да масавых забастовак і дэмонстрацый, да ўзброеньня рабочых, сялян і студэнтаў і падкрэсьлівае, што „толькі масавых выступленьні рабочых, сялян і ўсіх працоўных пластоў можа нанесьці паражэньне імпэрыялізму і Гоміндану.

Адозва заклікае рабочых, салдат, студэнтаў, сялян выступіць супроць нападу імпэрыялістых і Гоміндану на Савецкі Саюз. Зьвергнуць капіталюючы перад імпэрыялізмам Гоміндан і абараняць адзіную антыімпэрыялістычную сілу—кітайскія саветы і чырвоную армію. Компартыя Кітаю—адзіны кіраўнік антыімпэрыялістычнага руху.

Манэўры соцыял-фашыстых для адцягненьня рабочых ад антыфашысцкай барацьбы

БЭРЛІН. Кіраўніцтва нямецкай с.-д. партыі апублікавала адозву, у якой імкнецца скласьці ў рабочых уражаньне, што с.-д. сапраўды хочуць весьці барацьбу супроць фашызму. Такім чынам с.-д. хочуць адцягнуць масы працоўных ад рэволюцыйнай антыфашысцкай барацьбы. Дзеля характарыстыкі таго, як соцыял-фашысты збіраюцца пераходзіць „у наступ“ можна оказаць аб „масавым сходзе“, які заўтра склікае Саюз рэспубліканскага сьцягу, пад лёзунгам! „Чаша поўна.—дзяржава, ўмяшайся“!

Белагвардзейцы на арэне захопніцкіх дзеяньняў

БЭЙПІН 29. Харбінскія кітайскія газэты паведамляюць, што дэлегацыя расійскіх белагвардзейцаў уступіла ў перагаворы з японскімі войскамі па пытаньню пераходу белых у японскае падданства.

Чутка аб згодзе Чжан-Сюэ-ляна

Організаваць „нэйтральную зону“

ШАНХАЙ. Японскі паверанцы ў справах абмеркаваў з Чжан-Сюэ-Лянам проэкт згоды адносна організацыі „нэйтральнай зоны“ ў раёне між Мукданам і ШанхайХуанам. Па чутках Чжан Сюэ-Лян нібыта выказаў згоду (пры ўмове адобраньня з боку Нанкіна) на вывад кітайскіх войск і перанясеньне Манчжурскага ўраду з Цзінчжоў у Шанхайгуань з тым, каб пакінуць на старой тэрыторыі кавалерыю, Чжан Сюэ Лян чакае інструкцыі з Нанкіна.

Японскія войскі гатовы да выступленьняў

ТАКІЁ 30. Як паведамляе агенцтва „Сімбун рэнго“ з Мукдэну, штаб японскіх войск атрымаў весткі аб тым, што войскі генэрала Ма выступілі з Хайруня ў кірунку Цыцыкару. У зьвязку з гэтым, японскі ўрад даў загад войскам Цыцыкаро быць гатовымі да выступленьняў.

Падрабязнасьці ваеннай правакацыі

Арыштаваны 3 вагоны зброі

Справа аб забясьпечаньні зброяй генэрала Ма з Дайрэна набывае ўсё больш шырокі характар. Прапагандаю шматлікія арышты японскіх служачых як у Дайрэне, так і ў Мукдэне.

Вялікае ўражаньне ў замежных японскіх колах зрабілі весткі аб арышце ў Мукдэне трох вагонаў зброі, адпраўленых з Дайрэна з прызначаным генэралу Ма у Цыцыкар. У зьвязку з затрыманьнем гэтых 3-х вагонаў праведзены шматлікія арышты. У ліку арыштаваных, акрамя вялікай колькасьці японцаў, ёсьць польскія, [illegible] сія і амэрыканскія грамадзяне.

Адказны рэдактар Л. Перліна.

Да ўсіх рэдколегій раённых, колгасна-саўгасных і фабрычна-заводзкіх газэт і рабселькораў.

5-га сьнежня выходзіць пашыраны нумар газэты „Рабселькор“, цалкам прысьвечаны спэцыялізаваным раённым і кустовым зьлётам рабселькораў. Нумар зьмяшчае частку вопыту опэрацыйна-масавай работы, праробленай нізавым друкам і рабселькорамі БРСР. Гэтым вопыт павінен быць распаўсюджаны на ўсе прадпрыемствы, саўгасы і колгасы.

Заказы па тэлеграфу шлеце ў кантору выдавецтва „Зьвязда“: Менск, Савецкая, 63.

Сёньня, 2-XII-31 г. а 8-й гадз. увеч. у памяшканьні Дому Навукі і Тэхнікі (пакой адпачынку) склікаецца нарада ўсіх сэкратароў калітэтаў, калектываў і ячэек менскай арганізацыі ЛКСМБ.

З прычыны асаблівай важнасьці пытаньняў, сваечасовая зўка абавязкова.

Сэкратар менгаркому ЛКСМБ Янковіч.

АДРАС РЭДАКЦЫІ: Менск, вул. Карла Маркса, 38. Тэлефоны: рэдактара—7-25, сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ: Комсамольская 25, тэл. № 903. ГОД ВЫДАНЬНЯ XI.

Друкарня імя тав. Сталіна. Упаўнаважаны Галоўлітбелу № А—2522.